# Пазакласнае мерапрыемства «Табе, Беларусь, у вяках красавацца»

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне навучэнцаў

**М. Л. Федзюковіч-Раманюк,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 4 г. Іванава

**Падчас пазакласнага мерапрыемства «Табе, Беларусь, у вяках красавацца» ўдзельнікам прапануецца адправіцца ў займальнае падарожжа па родным краі, падрабязна пазнаёміцца з культурнай і гістарычнай спадчынай нашай Радзімы, яе дасягненнямі і подзвігам беларускага народа, успомніць пра выдатных асоб, якія ўнеслі свой уклад у развіццё нашай краіны, пра падзеі, якія пакінулі след у нашай гісторыі, і аб тых прыгажосцях, якія натхняюць нас на подзвігі. У завяршэнне мерапрыемства ствараецца прастора для адкрытай дыскусіі, дзе кожны можа падзяліцца сваімі думкамі і пачуццямі пра Радзіму, атрымае магчымасць пачуць розныя меркаванні і погляды, што дапаможа лепш зразумець адзін аднаго і ўмацаваць нашу агульную любоў да Беларусі. Удзельнікі мерапрыемства – вучні 7 класа.**

**Мэта мерапрыемства:** фарміраванне ў дзяцей вобраза Радзімы і гонару за дасягненні роднай краіны.

**Задачы:**

- пашыраць веды вучняў аб гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі;
- развіваць цікавасць да гісторыі роднай краіны;
- выхоўваць высокую грамадзянскасць, пачуццё патрыятызму;
- выхоўваць павагу да нацыянальнай культуры, традыцый, звычаяў.

## Ход мерапрыемства

**І. Уводны этап**

*Вучань чытае верш У. Караткевіча «Беларуская песня»*

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.
Што сляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,
Над ракою чырвонай і цьмянай палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых, як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба – разлівы ільноў.
Дзе мой край?
Там, дзе людзі ніколі ня будуць рабамі,
Што за паліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы, – ударыш, і зломіцца меч.
Дзе мой край?
Там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі,
Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.
Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Ты – наш край.

Ты–чырвоная груша над дзедаўскім домам,

Лістападаўскіх знічак густых фасфарычная раць,

Ты – наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому

Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць.

Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі

І апошняй раллёй, на якую ўпадзём у журбе.

Мы клянёмся табе, што ніколі,

Ніколі,

Ніколі,

Так,

Ніколі не кінем,

Не кінем,

Не кінем цябе.

**Настаўнік.** Добры дзень, паважаныя сябры! Вітаю вас на пазакласным мерапрыемстве «Табе, Беларусь, у вяках красавацца!». Вы, мабыць, заўважылі, што на вашых партах ляжаць папяровыя сурвэткі. Вазьміце, калі ласка, па адной і згарніце яе напалову любым спосабам. Адарвіце з любога краю вугалок. Згарніце яе яшчэ раз напалову і зноў адарвіце кавалачак з любога вугалка. Згарніце ў трэці раз напалову і зноў адарвіце. А цяпер разгарніце і прадэманструйце тое, што ў вас атрымалася. Наўрад ці знойдзецца пара сурвэтак, на якіх паўтараецца малюнак. Як вы думаеце, чаму мы атрымалі такі вынік? (*Дзеці адказваюць.)* Кожны чалавек унікальны, ён валодае толькі яму ўласцівымі якасцямі. Але, нягледзячы на тое, што мы такія розныя, многае нас аб’ядноўвае. Як вы лічыце, што можа аб'ядноўваць нас з вамі? (*Адказы дзяцей.)* Так, усе мы – жыхары выдатнай краіны. Наша Радзіма – Рэспубліка Беларусь. У кожнага чалавека ёсць Радзіма, і кожны любіць яе. Што ж абазначае слова «Радзіма»? (*Адказы вучняў.)*

Радзіма – гэта шчасце, Радзіма – гэта рай,

Радзіма – гэта песні, што льюцца з краю ў край.

Радзіма – гэта сонца, зямля ў зіхценні рос.

І любім мы Радзіму, яна – наш светлы лёс.

**ІІ. Асноўны этап**

**Настаўнік**. Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына. Гэтыя словы мы чулі з самых малых год, мы да іх прывыклі, як прывыклі да слоў мама, тата, сям'я. І, магчыма, мы яшчэ не задумваліся над тым, што значаць яны для кожнага з нас. Многае можа родная сям'я, многае можа родная зямля. Можа накарміць нас цёплым і смачным хлебам, напаіць крынічнай вадой, зачаравац сваёй прыгажосцю, даць сцяжынку ў самастойнае жыццё.

Беларусь – зялёны лісток на карце: лясы, пералескі, лугі, пушчы, ураджайныя палеткі. Вакол нас – карагод краін. Прыгадайце, калі ласка, з якімі краінамі мяжуе Беларусь? (*Дзеці прымацоўваюць на карце назвы краін: Расія, Украіна, Літва, Латвія, Польшча.*)

Наша Рэспубліка Беларусь – незалежная дзяржава і мае свае сімвалы. Назавіце сімвалы нашай дзяржавы. (*Дзеці адказваюць.)* Мы павінны ведаць свае сімвалы і адносіцца да іх з павагай і гонарам, як сапраўдныя грамадзяне сваёй краіны.

**Вядучы**. Нашую краіну называюць яшчэ зямлёй пад белымі крыламі. Расправіўшы белыя ветразі крылаў, ляцяць буслы. Іх у Беларусі вельмі шмат. Сваімі крыламі яны нібыта накрываюць нашу краіну. Таму яе так і называюць – зямля пад белымі крыламі. А што ж нясуць на сваіх крылах буслы? (*Дзеці называюць каштоўнасці Беларусі. На дошцы размешчаны буслы з каштоўнасцямі Беларусі.)* Буслы прынеслі нам каштоўнасці, якія трэба берагчы. Кожны грамадзянін павінен ведаць гісторыю сваёй краіны, яе мову, вывучаць прыроду і славутасці роднага краю. Бо дзякуючы культуры, прыродзе, традыцыям, сям'і будуецца квітнеючая будучыня нашага народа.

**Настаўнік.** А зараз папрашу вас быць уважлівымі: мы правядзём з вамі невялікую віктарыну і даведаемся, наколькі сапраўднымі грамадзянамі роднай зямлі вы з'яўляецеся.

***Віктарына***

1. Як у даўніну называлі Беларусь?(*Белая Русь.)*

2. Назавіце сінонім слова Радзіма. (*Айчына, Бацькаўшчына.)*

3. Колькі абласцей у нашай дзяржаве? Пералічыце іх.(*6: Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская.)*

4. Які злак намаляваны на гербе Беларусі? *(Пшаніца.)*

5. Якога колеру больш за ўсё на сцягу нашай рэспублікі? *(Чырвонага.)*

6. Якімі словамі пачынаецца гімн Беларусі? (*Мы – беларусы, мірныя людзі.)*

7. Ад якіх плямёнаў пайшлі беларусы? *(Крывічы, дрыгавічы, радзімічы.)*

8. Якая плошча нашай дзяржавы? *(207 тысяч кв. км.)*

9. Колькі краін мяжуе з нашай Беларуссю? Назавіце іх.*(5: Расія, Украіна, Літва, Латвія, Польшча.)*

10. Якая прыблізная колькасць насельніцтва нашай дзяржавы*? (Каля 10 мільёнаў чалавек.)*

11. Назавіце галоўныя рэкі Беларусі. *(Нёман, Прыпяць, Заходняя Дзвіна, Днепр, Сож, Беразіна.)*

12. Назавіце найбольш вядомых пісьменнікаў і паэтаў*(Якуб Колас, Янка Купала, Максім Танк, Максім Багдановіч і інш.)*

13. Хто з’яўляецца беларускім першадрукаром? *(Ф.Скарына.*)

14. Як звалі беларускую жанчыну, якую царква аб’явіла святой*? (Е. Полацкая.)*

15. Назавіце мемарыяльны комплекс, прысвечаны спаленым у час Вялікай Айчыннай вайны вёскам. *(Хатынь.)*

16. Калі наша краіна адзначае Дзень Незалежнасці? *(*3 *ліпеня.)*

**Вядучы.** Мая Беларусь…Па нашых землях тапталіся ворагі. Прыходзілі да нас з мячамі, з ружжамі і гарматамі, на танках і самалётах. Нішчылі людзей, палілі хаты, гарады, адбіралі скарбы, і не мінула гэта наш Іванаваўскі раён, дзе таксама да тла былі спалены некаторыя вёскі.

*Дзеці на дошцы на карце раёна размяшчаюць назвы вёсак, якія былі спалены ў гады вайны ў Іванаўскім раёне.(13 вёсак)*

**Вядучы**. Ніколі і нікому не ўдавалася зняволіць вольналюбівы народ. Званы Хатыні, мемарыял у Брэсцкай крэпасці-герой нагадваюць жывым: «Людзі! Помніце! Не дапусціце новай бойні!» Вялікую цану заплаціў беларускі народ за сваю свабоду. Загінуў кожны трэці беларус у гады Вялікай Айчыннай вайны. У памяць аб загінуўшых у час вайны ўзведзены мемарыялы славы, помнікі, на брацкіх могілках ніколі не вянуць кветкі.

*Вучань чытае верш А. Куляшова «Над спаленай вёскай».*

**Вядучы**. Светлая памяць усім воінам, якія абаранялі нашу Радзіму і далі магчымасць роднай краіне стаць самай прыгожай у свеце.

*Праца ў парах.*

***Заданне.*** Прайшло шмат гадоў, Беларусь вырасла. Разам з яе ростам з’яўляліся новыя дасягненні нашай краіны.У квадраце літар схаваны назвы 6 слоў, якія ўвасабляюць гонар нашай краіны. Ваша задача – адшукаць іх і запісаць.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | а | | |
| | | | | | | | | | | |
| | | | | б | | | | а | | |
| | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | |

1.А___________________
2.М__________________
3.П___________________
4.К___________________
5.Г___________________
6.С___________________

Медыцына, прамысловасць, спорт, гісторыя, адукацыя, культура – у кожнай з гэтых абласцей па праве ёсць чым ганарыцца.

*На дошку мацуюцца малюнкі.*

МЕДЫЦЫНА: перасадка органаў і хірургія – тое, чым славяцца беларускія дактары на ўвесь свет.

СПОРТ: Дар’я Домрачава, Антон Кушнір, Вікторыя Азаранка, Максім Мірны і інш.

КУЛЬТУРА: культурныя каштоўнасці нашай краіны – Белавежская пушча, Мірскі замак, Слуцкія паясы, Нясвіжскі замак, Сафійскі Сабор.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ: у нашай краіне ахопліваецца вялізная колькасць прамысловых галін, пачынаючы ад сельскай гаспадаркі і вырабам розных прадуктаў харчавання, заканчваючы машынабудаваннем і атамнай электра-станцыяй.

ГІСТОРЫЯ: беларуская зямля выгадавала шмат выдатных гістарычных дзеячаў, прадстаўнікоў літаратуры і мастацтва, палітыкаў і вучоных. Гэтыя вялікія людзі ўнеслі вялікі ўклад у гісторыю, развіццё культуры і навукі, як сваёй Айчыны, так і іншых дзяржаў. З апошніх касманаўт Марына Васілеўская.

АДУКАЦЫЯ: Рэспубліка Беларусь уваходзіць у групу 30 найбольш развітых краін па паказчыках у сферы адукацыі.

**Вядучы.** Наш народ заўсёды будзе памятаць імёны асветніцы Еўфрасінні Полацкай , першадрукара Францыска Скарыны і славутага паэта Сімяона Полацкага. Нельга не ўзгадаць Фёдара Дастаеўскага. Вядома, можна казаць, што ён тут ніколі не быў і нічога не напісаў. Але з Іванаўскай зямлі паходзіць род Дастаеўскіх. І сёння гэтыя мясціны наведваюць праўнукі і прыхільнікі творчасці сусветнага класіка. Але асабліва ганарацца ў раёне сваім земляком Напалеонам Ордам, які ўславіў не толькі родныя Варацэвічы, але і ўсю Беларусь далёка за межамі.

Ёсць і ў раёна сучасныя руплііўцы: тут на слыху імя Марыі Гарупы, якая пакінула вялікую спадчыну, узняўшы вялікі пласт інфармацыі аб вёсках Іванаўскага раёна. Усе дэталі выкладзены ў кнізе «Вёска, дзе буслы ўзнімаюць крылы». Рэгіён ганарыцца Анатолем Крэйдзічам, аўтарам цікавых кніг, Лізаветай Саханчук, якая піша цікавыя творы патрыятычнага і

краязнаўчага характару. Годны павагі паэт Андрэй Мазько, зачароўвае паэтычнымі творамі Надзея Паліўка...

Іванаўскі раён знакаміты не толькі выдатнымі людзьмі – адданымі сваёй малой Радзіме, сваёй справе, але і памятнымі мясцінамі, гісторыяй, і займае годнае месца сярод рэгёнаў Брэсцкай вобласці.

Сёння горад Іванава з’яўляецца культурнай сталіцай Беларусі. І гэта гаворыць аб тым, што тут сапраўды жывуць таленавітыя людзі.

Прыгожая наша Іванаўская зямля! З вышыні птушынага палёту выдатна відаць, як цёмна-зялёныя лясы змяняюцца жоўтымі палямі, салатавымі лугамі і карычневымі балотамі, усё гэта хараство перасякаюць блакітныя прамяні рэк, а паўсюль сінімі плямамі блішчаць сажалкі і азёры.

Зямля мая родная, Іванаўшчына! Усё ў цябе дзівоснае, усе поўніцца высокім сэнсам, і лёс твой – у тваіх уласных руках.

*Выконваецца музычная кампазіцыя на цымбалах.*

**Настаўнік**. А зараз я прапаную вам праверыць, наколькі добра вы ведаеце нашу культурную спадчыну. Мова чалавека, народа багатая, калі ў ёй шмат песень, казак, прыказак. Складзіце, калі ласка, прыказкі.

| | |
|---|---|
| Няма смачнейшай вадзіцы | бору песню спявае. |
| Усякай птушцы сваё | ад Радзімы не адракайся. |
| Родная зямелька як | і цябе пашануюць. |
| На чужыне і | дарэмна не гаворыцца. |
| Кожная сасна свайму | гняздо міла. |
| Родная зямля мякчэй | як з роднай крыніцы. |
| Бацькоў не цурайся, а | зморанаму пасцелька. |
| Шануй людзей, то | камар загіне. |
| Бацькоўскае слова | чужой пярыны. |

*Дзеці складаюць прыказкі і тлумачаць іх.*

**Настаўнік.** Галоўным багаццем любой краіны з’яўляецца чалавек, і якім вырасце гэты чалавек – такім будзе і будучыня краіны. І хай кожны

абавязкова падумае, чым мы, як грамадзяне сваёй краіны, можам ганарыцца і што самі можам зрабіць для далейшага росквіту нашай Радзімы.

*Вучні пішуць на сцікерах пажаданні роднай краіне і прымацоўваюць на дошку.*

**III. Заключны этап**

**Настаўнік**. Памятайце: за намі будучыня. Беларусь сучасная крочыць разам з прагрэсам і часам. Умелая, таленавітая, яна будуе і вырабляе, выкарыстоўвае інавацыі і высокія тэхналогіі, актыўна ўдзельнічае ў сусветным інтэграцыйным працэсе. Любіце і шануйце сваю краіну, свой народ і яго гісторыю, захоўвайце і перадавайце яе сваім нашчадкам. Шануйце сваю малую радзіму, праслаўляйце яе сваёй крапатлівай працай, сваімі поспехамі і добрамі справамі.

*Вакальная група выконвае песню «Беларуская мова».*

## ЛІТАРАТУРА

1. **Буткевич, В. В.** Патриотическое воспитание учащихся: история и современность / В. В. Буткевич. – Минск: НИО, 2010. – 208 с.

2. **Сорокина, Е. Е.** Формирование эмоционально-ценностного отношения учащихся к миру при изучении регионов и стран в курсе географии на профильном уровне: автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.02 / Сорокина Елена Евгеньевна; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб., 2008. – 18 с.